Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

ЗАРА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 9 Вільня, Пятніца 29-га чэрвеня 1928 г. Год I

По загаду Старосты Гродзкага на м. Вільню, канфіскаваны № 8 газ. „Зара Працы“ за „Прамову пасла Ф. Валынца ў часе дыскусіі над бюджэтам Міністэрства Справядлівасьці“.

Дзе лякарства?

Калі выясьнілася пасьля выбараў, што з разгромам „Грамады“ беларускі радыкальны рух ня толькі не аслаб, але дух яго яшчэ больш паглыбіўся і ўзмацніўся:—стабілізаваўся, пачалася прадаўжацца старая лінія „павядзеньня“, уносячы толькі сюды розныя „выналязкі“. „Дзе сілаю ня возмеш, там хітрасьцю і подласьцю“.

Віленскія „крэсовыя“ „цэнтравікі“ з пад знаку „курвіленцаў“ спачатку думалі хітра зрабіць пэўныя „посуненьця“ ў напрамку залагоджаньня эканамічных патрэбаў беларускага сялянства і тады... ўсялякія і нацыянальныя і сацыяльныя імкненьні беларуса-селяніна самі сабой адпадуць. „Беларускую-ж інтэлігенцыю ўдасца перакупіць“—думаюць сабе „курвіленцы“. Паводле гэтай думкі, і заложаны быў польска-беларускі „спадароўскі зьвяз“, які меўся „эканамічна“ „вырашаць балючае беларускае пытаньне“. Але што-ж? Не пасьпеў „зьвязацца“ гэты „зьвяз“, ён ужо і разлезся. А на перакупства, аб якім так лятуцяць „курвіленцы“, нямнога знойдзецца „спадароў“. Тады „новы спосаб“ выплыў — спосаб пэрсанальнага і арганізацыйнага застрашваньня і націску, дзе ізноў-жа першую дудку іграюць „курвіленцы“. Аб гэтым „новым спосабе“ могуць пасьведчыць прадстаўнікі радыкальнага беларускага грамадзянства, а таксама адносіны „сільных міра сего“ да адзінае саліднае арганізацыі ў Заходняй Беларусі—Т-ва Беларускае Школы.

Мы пэўны, што не адзін яшчэ будзе такі „новы і найнавейшы спосаб“, але наперад скажам, што не зьліквідуюць яны таго, што пасеяна ў нас перадуманай палітыкай,—што не злагодзяць яны балячак беларускага працоўнага народу. Гэтыя „спосабы“ не зьяўляюцца лякарствам для збалелага яго арганізму.

Было-б вялікаю наіўнасьцю верыць ня толькі ў дабрадзейнасьць гэтых курвіленскіх лякарстваў па каплі ў дзень, а верыць наагул у самую магчымасьць залячэньня балячак беларускіх працоўных гушчаў праз пануючую польскую буржуазію.

Для беларускіх працоўных гушчаў было і астаецца назаўсёды адзінае лякарства — вера ў свае ўласныя сілы, у сваю сьвядомасьць і арганізованасьць, моцнае пераканаaньне, што толькі сваімі ўласнамі сіламі ў саюзе з работнікамі і сялянамі ўсіх нацыянальнасьцяў Польшчы і ў барацьбе, як з польскай, гэтак і з сваей буржуазіяй і яе прыхвостнямі—беларускія сяляне і работнікі здабудуць сабе і належныя правы і наагул сваё месца пад сонцам.

Ці—„Усходняе Лёкарно“ за скасаваньне акупацыі Надрэніі?

Скасаваньне акупацыі для Нямеччыны мае такое вялізарнае значэньне, што нічога дзіўнага ў тым, што нямецкая дыплёматыя прыняла ўсе меры, каб у першую чаргу зьліквідаваць усе страхі галоўнага акупанта — Францыі, задаволіўшы, можа, і ўсе яе жаданьні ў галіне „кампэнсацыяў“. Аб гэтым досыць ясна кажуць весткі парыскіх карэспандэнтаў венскіх газэтаў (паданыя „Пат.“). Яны кажуць, быццам францускі ўрад ужо дагаварыўся з нямецкім адносна да „палітычных і фінансавых умоваў, якія з роўнай сілай будуць вязаць Нямеччыну, як і ваенная акупацыя, зьяўляючыся адначасна пэўнай(?) формай гарантыі і для Польшчы“. Вось гэтыя падрыхтаваныя ўжо „ўмовы“ і выклікалі трывогу ў лягеры францускіх мілітарыстаў у іх органе „Авэнір“. Венская прэса цьвердзіць, што гэтая згода Францыі на замену акупацыі гэтымі новымі „ўмовамі“, выклікала трывогу і ў польскіх палітычных колах, вызваўшы і візыту мін. Залескага ў Парыж.

Нарады міністра Залескага з Брыянам, як падчырківае венская прэса, мелі важны і афіцыяльны характар — бо-ж вяліся ў прысутнасьці польскага пасла ў Парыжу і сэкрэтара франц. міністэртва загран. спраў п. Бэртлё. Далей венская прэса зусім ясна кажа, што польскі міністар патрэбаваў—або ўтрыманьня надалей акупацыі, або такога-ж прызнаньня Нямеччынай нятыкальнасьці польскіх граніцаў, якое Нямеччына дала Францыі і Бэльгіі—у Лёкарнскіх трактатах.

Гэта значыць, што польскі міністар трэбуе ад Нямеччыны — за згоду Польшчы на скасаваньне акупацыі — так зван. „Усходняга Лёкарно“.

Які быў рэзультат нарадаў польскага міністра з францускім, мы дакладна ня ведаем. Сам польскі міністар, выяжджаючы з Парыжу, заявіў прадстаўніку „Пат“ толькі, што ён „вельмі здаволены гутаркай з кіраўнікамі францускай палітыкі, — бо гэтыя гутаркі сцьвярдзілі поўную згоднасьць пагляdaў гэтых кіраўнікоў францускай палітыкі з пунктам гледжаньня Польшчы — на розныя бягучыя справы загранічнай палітыкі“.

Але вось, карэспад. „Кур. Варш.“, апісваючы ўрачысты банкет, на якім мін. Залескі оказаў сваю прамову, дадае, што, нажаль, „толькі гэтая польская прамова была адзінай у поўным значэньні слова вялікай палітычнай прамовай, поўнай зьместу і акцэнтаў, ясна падчырківаючых вагу польска-францускага саюзу ў сыстэме міру і бясьпечнасьці ў Эўропе... Тады як усе тры францускія прамовы (міністра Марэна, старшыні сэнату Думэра, навет самога Поля Бонкура) круціліся навакол француска-польскага саюзу — больш у галіне сантымэнтаў, чым рэальнага супрацоўніцтва саюзьнікаў у справе абароны міравых трактатаў“... Карэспандэнт — „тым больш шкадуе, што францускія аратары — не скарысталі з дасканалага прыпадку, але— устрымаліся ад таго, каб надаць візыце мін. Залескага характару запраўднай маніфэстацыі француска-польскай салідарнасьці на тэрэне міжнародавай палітыкі, — бо-ж вялікія палітычныя банкеты павінны якраз служыць дзеля гэткай мэты“...

Карэспандэнт польскай газэты пацяшае свой жаль тым, што — „салідарнасьць гэта бясспрэчна знайшла сабе практычнае вырашэньне ў сакрэтных нарадах мін. Залескага з прэз. Думэргам, Пуанкарэ і Брыянам“. Але сумна падчырківае ён той факт, што—польскаму кіраўніку замежнай палітыкі мін. Залескаму на яго „вялікую палітычную прамову“ — з ясным і выразным пратэстам проці скасаваньня акупацыі, дзеля чаго ён спэцыяльна прыехаў у Парыж,—не адказаў на банкеце па сутнасьці палітычнай справы зусім ніхто з францускіх палітыкаў, а перадусім не адказаў сам адказны кіраўнік загранічнай палітыкі Францыі — Брыян... А гэта пэўне-ж ня кажа аб поўні гэтай салідарнасьці...

Вялікі сумліў у гэтай поўнай француска-польскай салідарнасьці ў справе акупацыі выражаюць і парыскія карэспандэнты нямецкіх газэтаў. Адна з іх піша: „Калі мін. Залескі ў Парыжу даў выраз свайму „поўнаму здаволеньню“ станам адносінаў Польшчы і Францыі, дык ён апіраўся больш, відаць, на сваіх надзеях, чым фактах. Бо-ж тымчасам стан рэчаў — зусім не такі, як можна было-б вывесьці з заяваў міністра Залескага ў справе акупацыі Надрэніі. З яго заявы выходзіла б, што справа новых гарантыяў над Віслай — у разе скасаваньня акупацыі Надрэніі — ня толькі была абгаворана, але і вырашана ў пэўнай меры ў гутарках яго з францускімі міністрамі. „Але-ж у гэтай справе ён яшчэ толькі распачаў гутаркі“. (Гл. „Кур. Ілюстрав. Крак.“ тэл. 16-6).

Нямецкая, аўстрыяцкая і ангійская прэса падчырківае, што міністру Залескаму быццам вельмі пашкодзіла ў яго гутарках у Парыжу яго вясеньняя падарожжа ў Рым: бо-ж якраз быццам ад таго часу асабліва шпарка пайшло зьбліжэньне паміж Нямеччынай і Францыяй.

Нямецкая прэса страшэнна абураецца на міністра Залескага за яго прамову і за націск на францускі ўрад — у справе ўтрыманьня акупацыі.

Дэмакратычная прэса падчырківае, што „паразуменьне паміж Польшчай і Нямеччынай будзе немагчыма, калі польскі міністар будзе ўсьцяж казаць такія прамовы“ ды „мяшацца не ў свае справы, як напр., у справу Надрэніі“. „Паміма волі мін. Залескага, піша орган нямецк. дэмакратаў, думка аб пераглядзе міравых трактатаў заваёўвае сабе ўсё больш прыхільнікаў, дый — бясcумліўна пераможа, ня гледзячы на драўняныя запоры мін. Залескага“. („Кур. Варш.“ тэл. 15-6).

Слушна ў сьцягу гутарак з журналістамі мін. Залескі адказаў на гэта, што Польшча, як падпісаўшая Вэрсальскі трактат, мае фармальна поўнае права мяшацца і ў справу акупацыі Надрэніі. Але зусім іншая рэч, ці пратэст польскага міністра, папсаваўшы яшчэ горш і без таго нядобрыя стасункі паміж Польшчай і Нямеччынай, давядзе да практычных рэзультатаў. І тутака ляжыць цэнтр палітычнай ацэнкі кроку польскага міністра.

Паданыя ў польскіх газэтах галасы ангійскай прэсы („Кур. Варш.“ тэл. 15-6—Лёндан) кажуць, што „ангійскі ўрад ня можа прыняць польскага тлумачэньня Вэрсальскага трактату“...

У кожным разе — бясспрэчна, што — ані затрымаць скасаваньне акупацыі, ані змусіць Нямеччыну да „Усходняга Лёкарно“, (да выракэньня думкі аб пераглядзе сваіх ўсходніх граніцаў), на фармальнай праўнай падставе Вэрсальскага трактату — ня можна; ня мае і палітычнай сілы на гэта. Бо-ж трактат (§ 19 Статуту Лігі Нацыяў) сам выразна прадбачыць — прынцыповую магчымасьць, а значыць і права заінтэрасаванай дзяржавы,— падняць справу „перагляду трактатаў, якія зьявіліся нявыканальнымі“, указвае і шлях і спосаб такога перагляду.

—·—

У заключэньне адзначым цікаўны зьбег акалічнасьцяў.

У той самы дзень 11 чэрвеня, калі ў Парыжу мін. Залескі казаў сваю вялікую палітычную прамову проці скасаваньня акупацыі, у Вашынгтоне яго амэрыканскі калега, дзяржаўны сэкрэтар у справах загран. палітыкі Кэллог, паведаміў Сэнат—аб запрашэньні Польшчы да перагавораў аб прапанаваным ім трактаце „вечнага міру“, — забараняючага ўсялякую вайну. Як ведама, проці такой забароны ўсялякай вайны запратэставала адразу Францыя, лічучы, што такі праект — шкодны для яе і карысны для поўнага вызваленьня Нямеччыны. Пэўне-ж—заключэньне такога трактату, гарантаванага навет Амэрыкай, зрабіла-б ужо зусім немагчымым і недарэчным далейшае ўтрыманьне ня толькі акупацыі нямецкай зямлі, але і наагул утрыманьне якой-небудзь няроўнасьці паміж пераможцамі і пераможанымі. Такі трактат аб „вечным міры“ быў-бы цяжкім ударам па Вэрсальскаму трактату. Дык вось, напрыклад, „Кэльнская газэта“ і кажа, што — „візыта мін. Залескага ў Парыжу была ня столькі дэманстрацыяй проці Немцаў, сколькі — проці праекту Кэллога“. Ня будзем разьбіраць, слушна гэта, ці не. Адзначым толькі, што і Амэрыка ясна і выразна памагае Нямеччыне скасаваць акупацыю, усімі спосабамі, націскаючы на саюзьнікаў у гэтым кірунку.

(К а н е ц).

Дымісія маршалка Пілсудскага і яго ураду (?).

27-га гэта чэрвеня Прэзыдэнт Рэспублікі падпісаў наступнае распараджэньне:

„Да Пана Першага Маршалка Польшчы Язэпа Пілсудскага, Старшыні Рады Міністраў і Міністра Спраў Вайсковых. Варшава.

Прыхіляючыся да прадстаўленай просьбы аб дымісіі, звальняю Пана з Ураду Старшыні Рады Міністраў і Міністра Вайсковых Спраў разам з цэлым габінэтам“.

Адначасна з гэтым Прэзыдэнт Рэспублікі выдаў распараджэньне, назначаючы Старшыней Рады Міністраў Казіміра Бартэля і пакідаючы на сваіх становішчах усіх міністраў, у тым ліку і марш. Пілсудскага на становішчы Міністра Вайсковых Спраў, апрача міністраў Рэлігіі і Асьветы — Дабруцкага і камунікацыі — Ромоцкага. Міністрам рэлігіі і асьветы назначаны д-р Казімір Сьвітальскі, а міністрам камунікацыі інж. Кюн.

Што азначае гэтая „дымісія“ — цяжка пакуль-што сказаць.

Як бачым, дык ніякай фактычна „дымісіі“ Пілсудскага і яго ўраду няма. Ёсьць перамяшчэньне амаль-што адных і тых самых асобаў.

Значыць ад гэтай фармальнай, папяровай зьмены ня можа быць ніякай зьмены палітыкі ўраду, прынамсі лепшай для працоўных, бо ўвесь склад міністраў, апрача міністраў з дзьвюх галінаў, з якой адна ня мае ніякай палітычнай ролі, астаўся той самы.

Дык навошта-ж гэтая новая „грыміроўка“? Пэўна нейкая новая хітрасьць, якая пакуль-што ад нас скрыта.

———

Гэтае распараджэньне цікава яшчэ і з іншага боку. Яно разьбівае даўно разьбіты польскі парлямант, бо ў парлямантарных краёх зьмена габінэту адбываецца толькі тады, калі гэтага зажадае, або на гэта згодзіцца парлямант — „прадстаўнікі народу“, і ў Польшчы, значыць, гэта павінна было бы быць толькі з жаданьня ці дазволу Сойму.

А тут — „ні села, ні пала, падай баба сала“ (на хаўтуры па Сойму і „волі“ народу)!

Нячуваныя здарэньні у югаслаўскім парляманьце.

I. Забойства двох, раненьне некалькіх паслоў-харватаў—з апазіцыі сэрбскім цэнтралістам.

Уся Югаславія, а асабліва-ж, ведама, Харватыя,—страшэнна ўсхваляваны нячуванымі падзеямі ў Скупшчыне (Югасл. парлямант), на паседжаньні якой—забіты былі два паслы-павадыры харвацкай сялянскай партыі Радзіч і Басарычка. Забіты ня сам галоўны павадыр Харватыі знамяніты Сьцяпан Радзіч, а яго пляменьнік; але і сам Сьцяпан—цяжка ранены, побач з іншымі 3 сваімі бліжэйшымі таварышамі.

Газэты падаюць такі ход трагічнага выпадку ў парляманьце.

Як высьвятляла ў апошнія дні і наша газэта, у Югаслаўскім парляманьце—ў зьвязку за націскам з боку „загранічнага капіталу“—праз югаслаўскі ўрад — на парлямант краю (ў справе капітуляцыі на карысьць Італіі)—ў апошнім асабліва завастрыліся адносіны паміж урадавай большасьцяй і апазіцыяй. Апазіцыя, як ведама, пастанавіла тасаваць проці ўраду ўсе спосабы актыўнай абструкцыі. Нармальная праца парляманту амаль што ня спынілася цалком: паседжаньні прыходзілася перарываць усьцяж. А якраз адначасна ў Лёндане, куды, як ведама, быў вызваны, апроч сядзеўшага там ужо мін. фінансаў і мін. замежн. спраў,— каб — побач з фінансавымі варункамі пазыкі, падпісана была ад імя ўраду і палітычная капітуляцыя Югаславіі перад Італіяй (перад загранічным капіталам). Дзіва што ўрадавую большасьць выводзіла канчальна з раўнавагі абструкцыя апазіцыі, якая псавала ўсю ўрадавую йгру ў Лёндане.

А калі да гэтага дадаць, што фактычнымі павадырамі апазіцыі, бараніўшымі ў даным выпадку лепш саміх сэрбскіх урадавых радыкалаў-нацыяналістаў-цэнтралістаў, зьяўляліся харвацкія аўтанамісты (толькі што быўшыя навет—рэспубліканцамі—незалежнікамі...), з Радзічам на чале, дык—ці—паводле знанай нам тэрміналёгіі—„нацыянальныя меншасьці краю, дык можна добра зразумець, што такое палажэньне магло завяршыцца толькі катастрофай.

Паседжаньне парляманту ў той фаталь-

ны дзень распачалося цёмнымі пагрозамі з боку „радыкалаў“.—З лавак харватаў нясьліліся, відаць, балюча колючыя ў вочы сэрбаўдзяржаўнікаў словы — аб іх капітуляцыі перад Мусолінi, тады, калі пасол „радыкал“ крыкнуў у іх бок: „Сьцяражэцеся, каб не далажылі за гэтыя абразы сваімі галовамі“... Уся апазіцыі востра запратэставала проці гэтых нячуваных у парлямантах пагрозаў. У адказ на пратэсты п. Паповіч яшчэ раз паўтарыў пагрозу. „Заплаціце сваімі галавамі за гэта“. Тады ў салі паўстала нячуваная бойка. Старшыня перарваў паседжаньне. Пасьля ўзнаўленьня паседжаньня адзін з павадыроў сэбраў-цэнтралістаў („радыкалаў“) пас. Рачыч заявіў, што ён цалком салідарызуецца (далучаецца) з словамі п. Паповіча. Тады з боку апазіцыі ізноў пачаліся крыкі пратэсту, а з лаваў харвацкіх паслоў пасыпаліся на п. Рачыча крыкі, напамінаючы яму—аб нячыстых крыніцах яго багацьця. Старшыня ізноў зачыніў паседжаньне. У перарыве пас. Рачыч, з крыкам: „застралю кожнаго, хто падойдзе да мяне, выхапіў з кішэні рэвальвэр ды даў шэсьць стрэлаў у бок харвацкіх лавак. 5 стрэлаў трапіла ў харвацкіх паслоў, кладучы на мейсцы 2 і ранючы 4. У часе перапалоху забойца ўцёк з салі ў пакой міністраў, адкуль зьбег на вуліцу.

II. Кароль у шпіталю каля Радзіча.

Зараз-жа пасьля катастрофы ў шпіталь, дзе ляжалі забітыя і раненыя, прыехаў карол Аляксандар, які, аддаўшы сумныя ганоры забітым, быў прысутным пры апэрацыі над Сьцяпанам Радзічам (апэрацыя добра ўдалася) і размаўляў з ім. Вечарам ізноў асабіста наведаўся да раненых.

III. Адозва з боку ўраду.

Зараз жа пасьля здарэньня сабралася рада міністраў. Рада міністараў выдала адозву да насяленьня, у якім асуджае забойства, выражае спачуцьцё ахвярам і заяўляе, што аддасьць справу ўгалоўнаму суду; хаўтуры ахвяраў урад прымае на кошт дзяржавы. Удовам забітых будзе прызнана дажывотная пэнсія.

IV. Арышт забойцы.

Забойца, пасол Рачыч, зьявіўся да міністра ўнутр. спраў. Той адмовіўся прыняць яго, адказаўшы, што не жадае бачыць забойцу. Адначасна даў загад жандармам арыштаваць яго. Пасол ня чыніў апору.

V. У Харватыі рыхтуюцца вялікія дэманстрацыі.

Белградзкія газэты ўсхваляваны весткамі аб вялікім руху, распачаўшымся сярод харвацкага сялянства ў зьвязку з забойствам ды раненьнем яго павадыроў сэрбкімі нацыяналістамі. Сяляне маюць — зыйсьціся на вялікі збор у сталіцу Харватыі, Загрэб—падобна да вялікага сходу румынскага сялянства ў Альба Юлія. Мэта гэтага Сходу—дэманстрацыя на чэсьць Сьцяпана Радзіча. Перастрашаныя ўлады прынялі ўжо ўсе меры, каб перашкодзіць выкананьню гэтага пляну. У местах Харватыі—агульная жалоба. Зачыніліся ў дзень забойства 20 чэрвеня—ўсе крамы.

VI. Дэманстрацыя ў Загрэбе.

У Югаславіі наагул, як пішуць газэты, пануе спакой. Толькі ў сталіцы Харватыі адбылася вялікая дэманстрацыя. Цэлае места ўбрана жалобнымі сьцягамі. Толькі адзін гмах фабрыкі Арко (італьянца?), ня вывесіўшы сьцягу, справакаваў напад на яго таўпы. У гмаху выбіты шклы. Жандармэрыя з трудам стрымала натаўп ад разгрому гмаху. Значная лічба раненых.

VII. Да ўзаемных адносінаў ураду і апазіцыі.

Рада міністраў асобным лістом выразіла свой жаль сялянска-дэмакратычнаму блёку апазіцыі — з прычын забойства і раненьня яго павадыроў. Аднак-жа прэзыдыум блёку апазіцыі—пасьля нарады—гэтага ліста ад рады міністраў ня прыняў. Пасьля гэтага прэзыдыум прыняў пастанову—станоўча трэбуючую адстаўкі габінэту Вукічэвіча (радыкала).

VIII. У выніку выпадку — крызіс ураду.

20-га чэрвеня адбылося паседжаньне партыі „дэмакратаў“, на якім пастаноўлена— адклікаць з ураду ўсіх міністраў дэмакратычнай партыі. Безадкладна гэтая пастанова закамунікавана прэм'еру. У зьвязку з гэтым увечары была ізноў склікана рада міністраў, абрадаваўшая да ночы.

Выхад дэмакратаў з ўрадавай коаліцыі пазбаўляе ўрад падставы ў парляманьце.

Ходзяць чуткі, быццам на месца сучаснага ўраду, у склад якога ўваходзяць радыкалы, дэмакраты і некалькі драбнейшых групаў, мае быць створаны габінэт, у склад якога ўвайшлі-б прадстаўнікі ўсіх галоўных партыяў Сойму, ці так званы „канцэнтрацыйны ўрад“. На чале ўраду стаў-бы гэнэрал. У склад ураду меў бы ўвайсьці і Сьцяпан Радзіч. Ці-ж аднак-жа дойдзе да такой згоды паміж партыямі — няведама.

IX. Пастанова партыяў апазіцыі.

У зьвязку з падзеямі павадыры апазіцыйнага блёку, пасьля дыскусіі—пры ўчасьці раненага Радзіча — прынялі такія пастановы:

1. Сялянска-дэмакратычны блёк устрымаецца ад учасьця ў працы парляманту, дзе ў легальнай барацьбе за роўнасьць і справядлівасьць была праліта кроў прадстаўнікоў харвацкага народу, — датуль, дакуль ня будзе дадзена сатысфакцыя ды ня будуць дадзены гарантыі — поўнага раўнапраўя ўсіх народаў краю.

2. Само сабой, што блёк апазіцыі ня будзе падтрымліваць з сучасным урадам ніякіх стасункаў, адкідаючы пры гэтым усялякія прапазіцыі матэрыяльнага адшкадаваньня за беспаваротнае, неаджалаванае жыцьцё забітых сябраў-таварышоў і бацькоў асірацелых сем'яў. Блёк мае нераканаць, што народ сам знойдзе ўласныя срэдзтвы, каб забясьпечыць астаўшыяся без кармільцаў — бацькоў сем'і.

3. Аб'яднаная апазіцыя зьвяртаецца да народу, заклікаючы яго да захаваньня спакою ды даверра да сваіх павадыроў, якія ў суадказны мамэнт самі апублікуюць тыя рашэньні — у справах, зьвязаных з апошнімі падзеямі. У канцы пастанова кажа, што наступнае паседжаньне блёку адбудзецца ў Загрэбе.

X. Пасьля Белградзкага забойства.

Венская прэса сцьвярджае, што палітычнае палажэньне ў Югаславіі — пасьля белградзкіх стрэлаў—значна супакоілася. Быццам асаблівы ўплыў на супакоеньне мелі 2 факты: папраўленьне здароўя Сьцяпана Радзіча і асабістае ўмяшацельства ў справу караля Аляксандра. Абодва пачалі працу над залагоджаньнем канфлікту між харватамі і сэрбамі, які мог справакаваць агідны чын забойцы Рачыча. Радзіч знайшоў ужо ў сябе сілы, каб зьвярнуцца з супакойваючай адозвай-маніфэстам да харвацкага народу, заклікаючы яго захаваць поўную раўнавагу, не паддавацца правакацыям, давяраючы цалком сваім прадстаўнікам-павадырам у парляманьце. З свайго боку кароль быццам пастанавіў змусіць сучасны ўрад да адстаўкі, якой даўно напружана дамагаецца апазіцыя.

Дэфіцыт польскага гандлю.

Кожды месяц Галоўны Статыстычны Урад падае свае аблічэньні гандлёвага біляну Польшчы.

Па даным гэтай статыстыкі, гандлёвы білянс Польшчы за красавік раўняўся: прывоз тавараў вартасьці 265,625,000 злотых, вываз тавараў на—183,521,000 злотых. Значыць дэфіц. ў красавіку—82,104,000 злотых.

Вось ужо ў чатырох першых месяцах дэфіцыту гандлёвага білянсу выносіць больш 368 міль. злотых, што амаль не раўняецца дэфіцыту з ўсяго 1927 году, які раўняўся 380 мільёнамі злотых.

Цяпер-жа газэты (Rplita № 178) падаюць статыстыку торговага білянсу за м-ц травень.

Па статыстычных даных у траўні прывезена ў Польшчу тавараў на вартасьць 296,470,000, вывезна—на 201,776,000 злотых; дэфіцыт—94,694,000 злоты, на 12 мільёнаў і з большай паловай больш, як ў красавіку.

Віна дэфіцыту галоўным чынам у паступовым ўзросьце прывозу спажывецкіх прадуктаў, як пшаніцы і жыта.

Як бачым, дык польскі гандаль паважна хворы, калі яму не памагаюць ніякія „санацыі“, „стабілізацыі“, „пазычкі“ і экстрана выкліканыя заморскія дактары — амэрыканскія фінансісты.

30,000 тоннаў амэрыканскага хлеба.

Надаючы ў Гданск надышло з Амэрыкі 30,000 тоннаў (больш паўтора мільёна пудоў) збожжа для Польшчы. Ці хопіць гэтага хлеба Польшчы да новага, якога большая частка сёлета прапала, трудна сказаць. Але што заўсёды восеньню наша збожжа вывозіцца заграніцу абшарнікамі і спэкулянтамі зусім танна (ў заграничнай валюце), а каждай вясной прывозіцца тое-ж самае збожжа ў некалькі разоў даражэй, то аб гэтым маўчаць толькі тыя, каму гэтая „кампанія“ на вызыску бедных працоўных масаў—„на руку“.

Справа мандату камуністычнага пасла Бітнэра.

У мінулым месяцы польскія буржуазныя паслы дамагаліся ад Сойму скасаваньня пасольскага мандату камуністычнага пасла Бітнэра, прайшоўшага ў Лодзкай акрузе.

Ня могучы ўняважніць мандадату, але могучы адкінуць гэтую справу, цяперашні быццам „левы“ Сойм умыў над ею рукі—адаслаў ў Найвышэйшы Суд, чым паказаў, што ня мае нічога проці, калі-б Найвыш. Суд уняважніў волю дзесяткаў тысяч працоўных,—калі-б скасаваў мандат пасла Бітнэра.

І вось гэтую справу, асновaную толькі на тым, што ў 1924 годзе пас. Бітнэр быў засуджаны за камуністычную дзейнасьць на 4 гады вастрогу і быццам гэтым ён пазбаўлены праў, і разглядаў надовячы Найвышэйшы Суд.

Ня маючы ніякіх довадаў на няважнасьць мандату, бо пасол Бітнэр папаў ў сваім часе пад амністыю, зьняўшую з яго і пасьледзтвы кары—пазбаўленьне праў, Найвышэйшы Суд прызнаў мандат кам. пасла Бітнэра правамоцным.

Ці-ж мала ёсьць такіх беспадстаўных „прыдзірак“ буржуазіі да прадстаўнікоў працоўных масаў, і ўсе яны праходзяць у гэтым „левым“ Сойме?

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Польска-Літоўскія перагаворы.

Дзеля перагавораў з Польшчай маецца ў сераду (27 чэрвеня) прыехаць ў Варшаву Літоўская дэлегацыя. Старшынёй гэтай дэлегацыі зьяўляецца дырэктар адміністрацыйнага дэпартамэнту М-ва Загр. Спраў д-р Заўпіус.

Міжнародавы Кангрэс міру ў Варшаве.

25/VI. у Варшаве адчыніўся чарговы міжнародавы Кангрэс міру. Дагэтуль зьехалася 150 прадстаўнікоў 16 розных дзяржаваў. Кангрэс адчыніў старшыня арганізацыйнага камітэту былы віцэ-прэм. Тугутт. У сваей прамове старшыня падчыркнуў адсутнасьць паважнага пасьпеху ў справе разбраеньня, бачучы прычыну гэтага ў тым, што дзяржавы больш займаюцца фармальнымі праўнымі спрэчкамі, тады, як трэба арганізаванай міжнародавай грамадзкасьці працаваць над псыхалягічным аздараўленьнем узаемных адносінаў народаў: узаемнай злосьці, зайздрасьці, недаверыя і г. д. Бо-ж інакш „старой культуры эўрапэйскай пагражае гібель“.

Старшыня міжнародавай Рады Пацыфістаў сэнат. Ля-Фонтэн (сацыяліст), сцьвярдзіўшы правал прошлагодняй працы камісіяў Лігі Нацыяў у справе разбраеньня, заявіў, што Кангрэс павінен якраз разгледзіць прычыны непасьпеху працы над разбраеньнем ды знайсьці практычныя шляхі для ажыцяўленьня шляхотнай думкі—абвясьціць вайну міжнародавым праступленьнем.

Арыштаваньне камун. пасла Бачынскага.

„Głos Prawdy“ у 172 нумары, падае вестку аб арыштаваньні камун. пасла Уладыслава Бачынскага, выданага ў сваім часе Соймам (судом).

Па словах гэтай газэты, п. Бачынскага арыштавана ў Варшаве ў памяшчэньні электратэхніка Крывіцкага, разам з Крывіцкім і яго прыяцелькай Пачынскай.

Пас. Бачынскаму пагражае 102 арт. К. К.

Пры арышце ўзмоцнены пастарункі паліцыі.

Яшчэ адна старонка упісана у гісторыю адраджэньня Беларускага Народу.

Яшчэ адзін лішні доказ вялікай жыцьцяздольнасьці Т ва Бел. Школы,—гэта арганізацыя Акружнай Управы на Баранавіцкі павет 27. V. 28 г. Гэты факт пацьвярджае, што Т-ва мае ўплывы на масы, што яно пусьціла глыбокія карэньні ў самую гушчу Беларускага Народу; гэты факт такжа сьведчыць, што ўсякі паход проці Т-ва, скуль-бы ён ні выходзіў, будзе паходам проці Беларускага Народу, проці яго самых жыцьцёвых інтарэсаў, бо зразумела, што народ, калі ад яго адабраць родную мову, вырваць язык, гіне для гісторыі так-жа, як і чалавек з перарэзанымі жыламі гіне ад крывацячэньня. Яшчэ больш яскравы доказ арганічнай сувязі Беларускага Народу з Т-вам будзем мець, калі ўспомнім, што Баранавіцкі павет і самае места лічыліся амаль не фальфэркам прайдзісьветаў і гастралераў, ласых на лёгкую пажыву коштам народу. Тут грасавала паўлюкевічаўшчына, дэмараліз. маладыя душы, тут „нядошлыя“ сэнатары і па сёньняшні дзень сіляцца рабіць агідную працу, зьбіваючы моладзь са свайго культурна-адраджэнскага шляху ў бок угодніцкай асыміляцыі, але-ж маса народная спакойна, моўчкі пераступіла праз авантурнікаў розных гатункаў і ў сваіх цяжкіх ад мазольнай працы буднях перайшла да парадку дня, да арганізацыі Управы Т-ва.

На зьезд прыбыла чалавек сорак з розных куткоў павету, перадавых і лепшых працаўнікоў на ніве культурнай. Пасьля адчыненьня зьезду Старшыня Т-ва Уласаў сказаў прывітальную прамову, у якой акрэсьліў культурна-адраджэнскі рух ад 1905 году і запрапанаваў ушанаваць устаўваньнем памяць усіх памёршых на слаўным шляху адраджэньня Беларускага Народу.

Для дакладу аб працы Т-ва на будучыню забірае голас сэкрэтар Галоўнай Управы Т-ва гр-н. **Шырма**. Высьвятляючы праўныя падставы, на якіх абапёрта існаваньне і праца Т-ва, ён дае зьезду патрэбныя інфармацыі аб правядзеньні школьнай акцыі і кажа аб значэньні, якое мае Народны Дом і бібліятэка-чытальня для пазашкольнай асьветы. Аднак значэньне Т-ва і яго праца, — кажа далей ў сваёй прамове гр-н Шырма, — не можа быць абмежавана толькі змаганьнем за школы і пашырэньнем духовай культурнасьці; наш абавязак, абавязак нашай арганізацыі праводзіць і маральную культурнасьць у масы, змагацца з хуліганствам і ўпадленьнем, якое дасталася нам, як гістарычная спадчына ад немагчымых для жыцьця варункаў. Праўда, цяжка змагацца з гэтым, многа прыкрасьцяў спаткае Вас, але адважна гляньце цемры ў вочы, высока трымайце свой культурніцкі сьцяг, бо гэта наша адзіная надзея і ратунак. У такіх выпадках, калі рукі апускаюцца з адчаю, калі ў хвіліны знямогі духовай чарвяк няверы грызе душу, шукайце ратунку і спачынку ў бяздоннай крыніцы нашых радасьцяў—у кніжцы, і асабліва ў творах родных пісьменьнікаў. На прыкладах іншых народаў мы бачым, як роднае слова народу, родная кніжка разьбівалі путы няволі, няслі народу сьвядомасьць і прывадзілі да поўнага вызваленьня. У другой палове XIX стагодзьдзя, калі мяшчанства духа запанавала ў польскім грамадзянстве, калі пэўная частка яго, прысмактаўшыся да царскага стала, у імя інтарэсаў сытага жалудка, здавалася, перастала адчуваць крыўды нацыянальнай няволі, — у гэты пэрыяд прамовіў да нацыянальнага сумленьня польскага народу мастацкімі вобразамі з яго гісторыі іхні пісьменьнік Г. Сенкевіч, які гэтым самым многа прычыніўся да паўстаньня Польшчы. У таго-ж Сенкевіча ў яго рамане „Quo wadis“ і мы знойдзем для сябе многа павучальнага. Простыя рыбакі, якія панеслі ў масы вялікія ідэі свайго Вучыцеля, перамаглі ўзброены, пачаваўшы над Эўропай, распусны Рым. Калі трэба было, яны, простыя людзі, спакойна і з радасьцяй выходзілі на арэну цырку ў лапы дзікіх драпежнікаў, гарэлі смалянымі факеламі за сваю ідэю ў садах Нэрона. Але-ж гэныя чыста ідэйныя грамады прадаваліся рымлянам сваім-жа вызнаўцам Хілён-Хілёнідам. Гэта і ёсьць тое ўпадленьне, якое Вы спатыкаеце цяпер і ў нас у кожнай вёсцы. Хілён-Хілёніды прадаюць на кождым шагу ўсіх нас, сваіх родных бацькоў і ўвесь Беларускі Народ. Наша задача перамагчы гэтае ўпадленьне, даўшы маральнае ўзгадаваньне і тым, хто ўжо мае нахіл да прадажніцтва. Цяжка Вам сярод цемры, але ў цёмную ноч ярчэй мігаюць зоркі, і Вы цяпер зьяўляецеся тымі зоркамі на нашым цёмным небасхіле, да якіх так уважна прыглядаецца Беларускі Народ. Горда, як тыя Рыбакі, нясеце разам з Народам сваімі мазольнымі рукамі ідэю культурнага адраджэньня, не зьвяртаючы ўвагі на тое, што цемра хоча праглынуць Вас, зацягнуць у балота, у дрыгву. Вам ня страшна дрыгва балота, бо Вы бачыце сьвет сонца... З вялікім маральным задаволеньнем прыходзіцца адзначыць, што там, дзе Т ва мае магчымасьць працаваць, там гіне п'янства, там няма хуліганства, там у маладых душах пачуцьцё праўдзівай чэсьці і маральнасьці, там пад простай сьвіткай б'ецца заправды інтэлегэнтнае сэрца. А гэты сынтэз—сынтэз мазольнай працы і веды— наш высокі ідэал. Толькі тады, калі будзем моцна стаяць на сваім культурна-нацыянальным шляху, можам надзеяцца разам з паэтам, што

„Зацьвіце наш край, як сонца,
Пасьля непагоды,
У роўным стане, ў роўнай долі
Між усіх народаў“...

Сярод агульнай цішы сябра **Казаноўскі** забірае голас для дакладу аб працы Жэрабкавіцкага гуртка. „У 26 годзе паўстаў наш гурток. Першая спроба культурнай працы скончылася сумна: ў нас пакралі рэчы, паламалі сцэну, папсабалі прылады. У мяне тады, так-жа, як і цяпер цяклі сьлёзы, але то былі сьлёзы гора і адчаю, што цемната і несьвядомасьць хочуць зацягнуць пятлю на шыі народу, а цяпер сьлёзы радаснага ўзварушэньня, што мы не адны, што нас многа, што наша праца дае вынікі. Я магу пацьвердзіць словы гр-на Шырмы, што Т-ва Бел. Школы мае вялікі дадатні ўплыў на масы. У нас за час існаваньня гуртка Т-ва тры разы адчынялася манаполька і тры разы зачынялася, і цяпер яна ня існуе, бо няма попыту на манапольную атруту. Наша вёска служыць добрым прыкладам для суседніх. На культурныя мэты гурток выдаў 860 злотых. Працуем шчыра і ўсіх заклікаем да працы!“.

Пасьля дакладу гр-на **Пасікевіча** аб працы гуртка ў вёсцы Канюшоўшчына, дзе пастаўлена 7 спэктакляў і складзена ўва ўсёй гміне школьных дэкляраціяў на 8 школ, забірае голас прадстаўнік Баранавіцкага гуртка гр-н **Шах**. „Баранавіцкі гурток, — кажа ён,—паўстаў да працы нядаўна, паўстаў тады, калі мы дакладна распазналі розьніцу між Паўлюкевічавай „Прасьветай“ і Т-вам Бел. Школы. Наш спэктакль заваяваў сымпатыі публікі. Калі вёска змагаецца і перамагае цемру, то нам прыходзіцца рабіць культурнае спаборніцтва, каб перамагчы моцныя чужыя ўплывы“.

Ад Малахоўскага гуртка дакладае аб працы гр-н **Кабушка Янка**, які зазначае, што хоць ладжаныя ў мінулым годзе спэктаклі давалі дэфіцыт, аднак яны ад працы не адмовіліся, будуць ладзіць спэктаклі навет бясплатна. Ліхасельскі гурток, па славах **Лобкі Лявона**, ладзіў спэктаклі ў в. Савічах і Пагарэльцах, Нясьвіскага павету, дзе моладзь ня вельмі прыхільна адносіцца да культурнай працы. Аб працы Кудзевіцкага гуртка дае справаздачу **Кастусь Галубовіч**, які адзначае перашкоды ў культурнай працы з боку ўлады і прапануе распаўсюдзіць на вёсцы падручнік гісторыі Беларусі, дзеля азнаямленьня з мінуўшчынай Бацькаўшчыны, бо практыка паказала сярод вясковых здольнасьць да самаадукацыі. Кацьмінаўскі гурток паўстаў у 28 годзе і ня мог яшчэ, як сьлед, распачаць сваю працу; беднасьць і стыхійныя няшчасьці руйнуюць селяніна, дзеля таго цяжка сабіраць складкі.

Пасьля дакладаў з мейсц адбыліся выбары Акружнай Управы, у склад якой ўвайшлі: **Галубовіч, Купрык, Шумскі Аркадзь, Казаноўскі і Клімка**.

У бягучых справах прынята пастанова дапамагчы ахвярамі на будову „Дому Беларускай Культуры“ ў Вільні.

На разьвітаньне ад імя старэйшай Вялейскай Акружнай Управы прывітаў зьезд пасол **Валынец**, які выказвае думку, што для поўнага культурнага адраджэньня вёскі пры такім магутным уздыме культурнай працы і бязумоўна пры спрыяючых абставінах патрэбна два гады, а ня дзесяць, як гэта зазначаў Старшыня Т-ва гр-н Уласаў.

Суд у справе вялікіх надужыцьцяў у ўрадавых даставах.

Акружны Суд у Львове пачаў разглядаць вялікую справу надужыцьцяў цэлага раду афіцэраў 13 батальёну корпусу ахраны пагранічча.

Падсудныя афіцэры, маёр Сакалоўскі, капітан Ілікоўскі, капітан Новабільскі, кап. Готвальд, паруччык Гвёт, мар. Осека і старшы сержант Тварэшчук абвінавачваюцца ў надужыцьцях на шкоду дзяржаўнага скарбу, якіх яны дапусьціліся пры даставах.

„Мёртвыя душы“ ў Ковелі.

У Ковельскай тэлеграфнай і тэлефоннай установе выкрыты надужыцьці на падставе сыстэмы г. званых „мёртвых душ“ г. ё. на ўпісваньні на платным сьпіску фікцыйных асобаў, за якія упісаўшыя іх урадоўцы бралі грошы. Галоўны вінаўнік надужыцьцяў начальнік Флемка ўцёк ня ведама куды.

Ці-ж можа хто, пасьля гэтага факту ўваскрашэньня „мёртвых душаў“ спрачацца ў вялікім поступе „маральнай санацыі“ ў Польшчы?!

Пагроза забастоўкі ў Прушкоўскай электроўні.

Работнікі Прушкоўскай электроўні, абслужваючай часьць Варшаўскіх прадмесьцяў і цэлы рад фабрык і заводаў у Гродзіску і Прушкаве, зажадалі павялічэньня ад 15 г. чэрвеня 25 прац. платы і, акрамя гэтага, нямалькі новых варункаў у зборнай умове.

Перагаворы работнікаў з дырэкцыяй ня далі ніякага рэзультату. У найбліжэйшых днях у гэтай электроўні можа пачацца забастоўка, піша „Głos Prawdy“ ў № 163.

Страшная бура на Паморы.

Апошнімі днямі на абшарах Быдгоскага і Выжыскага павету прашла вялікая бура, шкоды якой дасягаюць сотні тысяч злотых

У некаторых мяйсцовасьцях град павыбіваў збожжа да каліва, у другіх жа бура перайшла ў цыклён і разбурыла многа будынкаў. У Накле працякаючая праз горад рэчачка пазалівала, вышаўшы з берагаў, нізка стаячыя дамы, а град так зьбіў акалічныя пасевы, што іх мусілі зааралць, на нізкіх-жа мясцох паўсталі фармальныя вазёры.

Проба зламаньня забастоўкі каменяроў.

Саюз працадаўцаў Пазнанскага ваяводзтва, як падае прэса, распачаў энэргічную акцыю дзеля зьліквідаваньня трываючай ад 30 траўня забастоўкі каменяроў. Аднак, гэты энэргічны „штурм“ буржуазіі на работнікаў астаецца без рэзультату, бо работнікі не зьмянілі свайго жаданьня 50 прац. падвышкі.

Заграніцай.

Новыя алярмы радавай прэсы.

Карэспан. „Кур. Варш.“ ізноў даносіць з Масквы аб новай хвалі алярмаў у радавай прэсе. Прэса цьвердзіць, быццам група заходня-эўрапэйскіх дзяржаваў, з Англіяй на чале, усьцяж рыхтуецца да нападзеньня на С.С.Р.Р.

Найважнейшую ролю ў гэтым загаворы дзяржаваў проці ССРР, як цьвердзяць радавыя газэты, адыгрываюць Лёндан і Варшава. Асабліва дражняць маскоўскую прэсу два факты апошніх дзён: падарожжа ў Варшаву англійскага дыплямата Ліндсэя і візыта мін. Залескага ў Парыжу. Усе гэтыя алярмы перад усім скіраваны проці Польшчы, якую маскоўская прэса абвіняе ў нейкім імпэрыялізьме.

Радавая прэса—аб блізкай вайне.

Маскоўскія „Известия“, абгаварваючы агульна-палітычнае палажэньне ў Эўропе ды стараньні англійскай дыпляматыі ў справе стварэньня проці-радавага фронту, заяўляюць, што Эўропа стаіць напярэдадні новай вялікай вайны. Вайна гэта, варожыць радавая газэта, мае распачацца на Балканах, дзе Італія рыхтуе яўна напад на Югаславію. Выбух вайны газэта прадбачыць ужо вясной наступнага году. Характэрна, што кожная дзяржава, яўна рыхтуючыся да вайны, усьцяж цьвердзіць, што адзінай яе мэтай ёсьць захаваньне ды ахова міру“.

Рэзультат канфэрэнцыі міністраў Малай Антанты.

Пасьля канца канфэрэнцыі Малай Антанты тры міністры загран. спраў яе дзяржаваў выдалі афіцыяльны камунікат. Камунікат сьцьвярджае пасьпехі супольнай палітыкі дзяржаваў Малай Антанты—на карысьць іх усіх, а таксама на карысьць эўрапэйскага міру. Адносіны дзяржаў Малай Антанты з Англіяй, Францыяй, Італіяй, Польшчай, Аўстрыяй, а пасьля Лёкарно—і з Нямеччынай,—добрыя і прыязныя. У канцы камунікат кажа, што Малая Антанта, як „арганізацыя, перадусім створаная дзеля аховы міру“, асабліва вітае праект міравога трактату Кэллёга, жадае яму пасьпеху і далучаецца да яго. Ці-ж запраўды, як падае „ПАТ“, Малая Антанта далучылася да праекту Кэллёга аб спыненьні назаўсёды ўсялякай вайны — без французскіх засьцярогаў?

На канфэрэнцыі з журналістамі, пасьля канца сваей працы, міністры Малай Антанты, адказваючы на пытаньні, раскрылі крыху,—аб чым перадусім былі гутаркі на канфэрэнцыі паміж імі. На запытаньне аднаго з прадстаўнікоў прэсы, як глядзіць Малая Антанта на § 19 Статуту Лігі Нацыяў, які кажа аб магчымасьці і спосабе перагляду існуючых трактатаў, румынскі міністар Тытулеску высвятліў, што „гэты артыкул існуе ў Статуце ня дзеля таго, каб умагчыміць агітацыю за перагляд трактату, дый стварыць сітуацыю, калі-б стала канешным тасаваньне гэтага артыкулу“... „Але наагул Малая Антанта — зусім спакойна аднесна да гэтага артыкулу: для перагляду трактатаў патрэбна аднагалосная пастанова Рады. А М. Антанта якраз учора пастанавіла адкінуць усялякія спробы гэтага“.

Чыя-ж гэта віна?

Карэсп. „Кур. Варш.“ даносіць аб тым, што перагаворы ў справе заключэньня польска-радавага гандлёвага трактату, якія мелі ўзнавіцца ў пачатку чэрвеня, адкладзены на неазначаны час. Пэўне-ж, не бяз уплыву на гэты сумны для абедзьвюх старонаў факт былі і апошнія ноты — у справе расейскіх эмігрантаў у Польшчы, а моʼ і наагул—уся тая „чэмбэрленаўская палітыка“, як цьвердзіць радавая прэса, нібы той „нехта ў чорным“ убівае клін паміж Польшчай і ССРР.

Канфлікт між Радамі і Грэцыяй.

Паміж Грэцыяй і Радамі — з прычыны адмовы грэцкага парляманту ратыфікаваць (зацьвердзіць) гандлёвы трактат грэцка-радавы — выбухнуў дыпляматычны канфлікт. У адказ на гэта Радавы ўрад забараніў грэцкім караблям заходзіць да радавых партоў на Чорным моры. Пэўне-ж усё гэта—вынікі „міратворчай працы“ паноў Чэмбэрлена з Мусоліні.

Ваенная трывога ў літоўскай прэсе.

Афіцыяльны орган літоўскага ўраду зьмяшчае артыкулы, сцьвярджаючыя грозную сітуацыю ў Эўропе. Указываючы на трывогу ў ССРР з прычыны падрыхтаваньня проці-радавага блёку суседніх дзяржаваў, літоўскі афіцыёз кажа, што Радавы ўрад ня хоча вайны, але сцьвярджае, што Харкаў і Менск—наадварот — быццам чакаюць вайны з Польшчай (?). Што да Польшчы, дык быццам яна сыстэматычна рыхтуецца да вайны. Такім чынам, кажа газэта, у Усходняй Эўропе — аж зашмат выбуховых матарʼялаў, якія могуць быць узарваны першай шалёнай іскрай.

Літоўскі ўрад рыхтуе адказ на апошнюю ноту Польшчы.

З Коўны даносяць, што ўрад апрацоўвае адказ на апошнюю польскую ноту з пратэстам проці абвешчаньня Вільні сталіцай Літвы.

Справа Бэла-Куна.

Радавая прэса даведалася, што справа Бэла-Куна мае разглядацца ў Венскім судзе 26 чэрвеня. Быццам найбольш, што пагражае Бэла-Куну, гэта—8 месяцаў вастрогу.

Справа тварэньня нямецкага ўраду.

Справа тварэньня нямецкага ўраду спаткала новыя перашкоды: прускі прэмʼер — пад націскам с.-д. партыі—рашуча адмовіўся рэфармаваць сучасны прускі габінэт—на падставе „вялікай коаліцыі“, як гэта патрэбавалі „людоўцы“; тады яны з свайго боку адмовіліся ўвайсьці ў склад „вялікай коаліцыі“ агульна-нямецкага ўраду. Нямецкі прэмʼер Мюллер тады стаў вясьці перагаворы аб стварэньні ўраду на падставе малай — „ваймарскай коаліцыі“—цэнтра-леву — бяз учасьця „людоўцаў“.

Кандыдат на канцлера Мюллер разаслаў парлям. клюбам праект праграмы свайго будучага габінэту. Праграма зьмяшчае 17 пунктаў, паміж якімі ёсьць—амністыя, школьная ўстава, рэформа адміністрацыі, вызваленьне арміі („рэйхсвэру“) ад палітычных уплываў (з боку нацыяналістаў-манархістаў) і г. д.

Кангрэс Нацыянальнай Партыі.

У Маскву даносяць з Шанхаю, што там 16-га чэрвеня распачаўся кангрэс партыі „Гоміндан“. На павестцы кангрэсу, паміж іншым, справа выбару прэзыдэнта Кітайскай рэспублікі. Найбольшыя шансы дагэтуль мае быццам Чанг-Кай-Шэк.

Сталіца Кітаю—Нанкін.

Новая ўлада Кітаю канчальна пастанавіла перанесьці сталіцу з Пэкіну ў Нанкін. Нанкін—даўнейшая сталіца Кітаю — да яго заваяваньня манчжурскай дынастыяй, якая сталіцай зрабіла Пэкін.

Ген. Фэнг—ваенны дыктатар Кітаю?

З Шанхаю даносяць у Маскву, быццам ген. Фэнг абвясьціў сябе галоўным камандзірам усіх кітайскіх арміяў на правох дыктатара, аддаўшы аб гэтым загад да ўсіх камандзіраў паасобных вайсковых часьцей. Сэнсацыйная вестка гэта не пацьверджана пакуль-што. Найважнейшая рэч — у тым, ці зроблена гэта ў паразуменьні з двума другімі галоўнымі асобамі „Новага Кітаю“, Чанг-Кай-Шэкам і ген. Іенам, ці не.

Ці памёр Чанг-Тсо-Лін?

У Мукдэне—поўная путаніна. Некалькі дзён таму афіцыяльны камунікат ваеннай улады сцьвярдзіў сьмерць Чанг-Тсо-Ліна. А вось цяпер ізноў зьявілася на вуліцах места ўжо другая адозва, падпісаная нябошчыкам Чанг-Тсо-Лінам. Дык у Лёндане ўсьцяж ня хочуць верыць, што былы грозны дыктатар-найміт запраўды памёр, зьмяшчаючы камунікаты аб яго здароўі. Аднак-жа—з Мукдэна даносяць, што ўжо на месца бацькі назначаны ваенным губэрнатарам Манчжурыі яго сын.

З Сойму.

21-га чэрвеня па кароткім перапынку адбылося наступнае 25 паседжаньне Сойму. На паседжаньні ня было многа паслоў. Найбольш пустых лаваў было ў Б. Б., можа дзякуючы чаму, прайшоў украінскі ўнёсак у справе зачыненьня ўладамі 5 старшых клясаў украінскай гімназіі ў Львове. Гэтыя клясы былі зачынены за тое, што адмовіліся ад удзелу ў сьвяткаваньні 3 траўня. Аднак, ня гледзячы на, здаецца, так „спрыяючыя“ ўкраінцам варункі, дыскусія ў гэтай справе трывала надта доўга, закончыўшыся тым, што 147 галасамі проці 140 прайшоў украінскі ўнёсак.

У гэтым унёску — ўкраінцы дамагаліся, каб ўрад паўторна прыняў (бяз экзамену) гэтых вучняў у тую-ж самую гімназію бяз страты школьнага году.

На гэтым-жа паседжаньні Сойм разглядаў справу ўстрыманьня судоў проці паслоў: **Сасінскага**, (гр. Карфантага), **Вітаса** (Пяст.) **Дзівуа**, (ППС), **Плюры-Кісеневускага** (Str. Chł.).

Усе гэтыя польскія паслы зволнены ад суда. Аб беларускіх (Стаг. і Грэцкім) ня было чамусь і мовы.

Наступна Сойм выслухаў справаздачу праўнай камісіі аб урадавай амністыі. Пры галасаваньні Сойм адкінуў усякія папраўкі між іншымі і папраўку **Бел. Сял.-Работ. Пасол. Клюбу**, аб пашырэньні амністыі на „Грамаду“ і ўсе зьвязаныя з ею „праступствы“. Папраўку гэтую падаў і бараніў пас. **Гаўрылік**, прамову якога падамо ў наступным нумары.

„Амністыя“, прынята большасьцю, бяз ніякіх, як мы ўжо казалі вышэй, соймавых паправак.

Як многа скарыстае з гэтай буржуазнай „амністы“ працоўны Беларускі Народ, ня трудна хіба дадумацца.

Амністыя, прапанованая на аснове паразуменьня між Урадам і Праўнічай Камісіі і прынятая навет буржуазнаю большасьцю, настолькі крыўдзіць беларускі народ, што паслы з бел. сял.-работніцкага клюбу навет не галасавалі за яе, выдаўшы аб гэтым спэцыяльны камунікат, які надрукуем у наступных нумарох.

Па адчытаньні ўнёскаў і інтэрпэляцыяў—паседжаньне закончылася.

З ўнёскаў трэба адзначыць ўнёскі ўкраінскіх паслоў аб адкрыцьці ў Львове украінскага ўнівэрсытэту і аб зьмене школьных законаў на „крэсах“ (ustawy).

На гэтым паседжаньне Сойму зачынена з думкай мець яшчэ адно паседжаньне.

Праўная Соймавая Камісія ўхваліла праект уставы, рэфармуючай дэкрэт Прэзыдэнта Рэспублікі аб выдаваньні „Dziennika Ustaw“ так, што ўхвалы Сойму, ухільваючыя распараджэньні Прэзыдэнта Рэспублікі, маюць друкавацца ў „Дзенніку Уставаў“.

Прадстаўнікі клюбу Б. Б. устрымаліся ад галасаваньня.

Журнальная (часапісавая) „устава“.

21-га чэрвеня Праўная Соймавая Камісія пераслала ў падкамісію ўнёсак, у справе праекту ўставы аб унармаваньні праўных адносінаў (stosunków) журналістычнай прафэсіі. Падкамісія ўпаважніла гр. **Морка** да вядзеньня канфэрэнцыі з прадстаўнікамі журналістаў і выдаўцоў.

З Сэнату.

20 г. месяца пачалося паседджаньне Сэнату дзеля разгляду бюджэту на 1928-29 г.

Парадак дня прадстаўляўся наступна: 1) Выбар чатырох сябраў Трыбуналу Стану, 2) Справазданьне праўнай камісіі аб праекце закону (ustawy) у справе зьмены інструкцый (przepisów) закону (ustawy) цывільных распраў, датычачых забесьпячэньня паводзтваў і выкананьня прыгавараў проці камунальных саюзаў у Варшаве, Любліне і Вільні і 3) Справазданьне бюджэтнай камісі аб бюджэце.

Паседжаньне пачалося з прысягі беларускага сельсаюзьніка сэн. Рагулі.

Яшчэ гэтага-ж дня ў сэнацкіх кулуарах хадзілі пагалоскі, што Сэнат прыйме бюджэт без разгляду.

На наступным паседжаньні, 21-га пагалоскі гэтыя апраўдаліся — сэнацкая камісія прыняла бюджэт бяз зьменаў.

Аб такой пастанове генаральны рэфэрат, сэн. **Шарскі**, (ББ) адазваўся так, што хоць бюджэт страціў у Сойме многа сваіх залётаў, але-ж ён надышоў у Сэнат толькі 16, г. ё. так позна, што ня можа быць ніякай мовы, ня толькі аб грунтоўнай зьмене яго ў якой-колечы галіне, але і аб адпаведным разглядзе яго Сэнатам. Апрача таго, камісія стаяла на тым груньце, кажа сэн. **Шарскі**, што калі-б у Сойме праваліласа (11/20 гал.) хоць-бы адна сэнацкая папраўка, то праваліўся-бы і ўвесь бюджэт і ўрад мусіў-бы даваць новы бюджэт або прасіць правізорыя.

У канцы свайго справазданьня прамоўца ад імя камісіі прапануе Сэнату прыняць бяз зьменаў ухвалены Соймам бюджэт, як і далучаныя рэзалюцыі.

Як бачым, дык пашло „сьледам за дзедам“. Ня гледзячы на пасьпешную і павярхоўную малацьбу бюджэту Соймам і Сэнат быццам узяўся каля бюджэту—але ня толькі што не „малаціць“, ці не „калаціць“ яго, а толькі „падзівіцца“, што гэта за „штукенцыя“

І вось Сэнат падышоў да свайго абʼекту агляду дужа спрытна, навет геніяльна—адразу спераду і ззаду (з двух канцоў): каб скарэй акінуць вокам бюджэт, Сэнат злучыў у адну дзьве дыскусіі — агульную і падрабязную (паадзіночную).

Першым выказаўся сэн. Гэрбачэўскі (укр.) проці бюджэту. Наступна прамаўлялі прадстаўнікі польскіх партыяў. Пашлі, як звычайна, розныя асабістыя „інцыдэнты“ і „палітычныя мамэнты“. Напр. ППС дыскутуе з „Zw. Lud. Narodowym“, сэн. ксёндз **Альбрэхт**, таксама, заместа гаварыць аб бюджэце, „бароніць“ рэлігію і г. д. Дыскусія над бюджэтам скончылася 22. У часе галасаваньня бюджэт прыняты бяз зьмен значнай большасьцяй.

Гэты факт ёсьць першым самазабойчым шагам Сэнату, бо яскрава паказвае ўсю бескарыснасьць а навет і непатрэбнасьць Сэнату, як такой установы.

„Лебедзь, шчупак і рак“.

На апошнім сваім паседжаньні Сэнат большасьцю 51 проці 33 галасоў скасаваў акульнік аб выкладах („пацсе“) рэлігіі ў школах, а ў падрабязнасьці пастанову аб прымусе прысутнасьці вучыцялёў у рэлігійных „praktykam“ (службах). Сэнсацыяй галасаваньня быў падзел Б. Б., з якога кансэрватысты галасавалі проці „радыкалаў“, на чале з Мар. Шыманскім, галасаваўшых разам „лявіцай“ і меншасьцямі за скасаваньне.

Зачыненьне паседжаньняў Сойму і Сэнату.

У канцы мінулага тыдня Прэзыдэнт Рэспублікі зачыніў на неакрэсьлены час паседжаньні Сойму і Сэнату.

Калі скончыцца гэты „неакрэсьлены час“—няведама, але няма сумліву, што якраз тады, калі Ураду будзе што-небудзь ад Сойму патрэбна.

Работніцкая, ці навет—„камуністычная рэвалюцыя у Грэцыі“?

Пад такім загалоўкам зьмяшчаюць газэты весткі аб ахапіўшай увесь край забастоўцы работнікаў. Весткі, якія ідуць з Белграду—праз Вену—не высьвятляюць прычыну выбуху. Пачалася забастоўка, як кажуць весткі, з Салонікаў — сярод работнікаў на тытуневых фабрыках. Адначасна забаставалі працаўнікі сталічнай электроўні, якіх падтрымалі чыгуншчыкі. Мае быць, ці, кажа апошняя тэлеграма з Белграду, ужо абвешчана ды распачалася гэнаральная (агульная) забастўка ўсіх работнікаў у краі. Паводле апошніх аблічэньняў, бастуе ўсяго каля чверці мільёну работнікаў. Урад зараз-жа пусьціў у ход паліцыю і войска, у рэзультаце—зарэгістравана шмат забітых і раненых па ўсяму краю.

У Афінах (сталіца) ўсе ўрадавыя будынкі, магістрат, электроўня, фабрыкі і заводы—заняты войскам. Тэлеграмы кажуць аб вялікім хваляваньні сярод работнікаў. „Увесь рух набірае характэру рэвалюцыі“. Чым выкліканы беспасярэдня гэты грозны настрой работніцкіх масаў, весткі ня кажуць. У паасобных мейсцах, асабліва—партовых ці фабрычных—пасьля таго, як паліцыя спасавала цалком — дайшло да значных сутычак з войскам. У Пірэі (порт сталічнага места Афінаў) ідзе запраўдная бітва работнікаў з войскам: работнікі ўкрапіліся за барыкадамі, якія напружана штурмуе войска.

У м. Драме таксама дайшло да крывавай драмы. Бой ішоў цэлую ноч аж да рана. На плошчы лягло 30 работнікаў. Сярод паліцыі і войска—некалькі сотняў раненых. У м. Кавала таксама адбыліся вулічныя баі.

Пануе пераконаньне, кажа тэлеграма з Вены, што мэтай ўсяго распачатага работнікамі руху зьяўляецца „абвешчэньне дыктатуры пралетарыяту“...

Ці ня ёсьць усе гэта запраўда проста — правакацыя з зусім іншага боку?

Паветраны ваенны флёт Грэцыі выражае салідарнасьць з работнікамі.

Паводле тэлеграмы з Белграду І-я эскадра грэцкага паветранага флёту выразіла сваю салідарнасьць з бастуючымі работнікамі. Чыгункавы рух паміж Афінамі і Салёнікамі спыніўся з прычыны забастоўкі. Паліцыя арыштавала шмат камуністычных павадыроў. Урад па радыё даў загад крэйсеру Авароф вярнуцца ў Пірэй, дзе — чакаць на далейшыя загады.

Ген. Пангалес—павадыр... „камуністычнай рэвалюцыі“...

„ПАТ“ даносіць з Салёнікаў: Тутака думаюць, што ген. Пангалес—у кантакце з бастуючымі работнікамі. Дзеля таго—ўзмоцнена ахова крэпасьці, дзе сядзіць вязьнем былы дыктатар Грэцыі. Улады баяцца, што работнікі нападуць на замак ды — зволняць Пангалеса...

Гэтая вестка найбольш красамоўна кажа аб тым, як цёмна тое, што робіцца ў Грэцыі. Вязаць камуністаў ды дыктатуру пралетарыяту з дыктатурай ген. Пангалеса, як гэта робіць „ПАТ“, гэта — запраўдны, як кажуць, — „рэкорд“ добрай інфармацыі...

Вынікі.

Як аказалася, ці як даносіць афіцыяльныя крыніцы з Грэцыі, усе весткі аб распачаўшайся быццам „камуністычнай рэвалюцыі“ ў Грэцыі—сільна „перасолены“. Работніцкамі павадырам не ўдалося навет зрабіць агульную забастоўкі, каб дапамагчы пакрыўджаным работнікам тытунёвых фабрыкаў у Салоніках. Цяпер паміж уласьнікамі гэтых фабрыкаў і работніцкімі павадырамі ідуць перагаворы аб зьліквідаваньні канфлікту.

Наша хроніка.

Прыцыснутая горам пасьля сьмерці без пары пакананага хваробай майго мужа **Лукаша Арэхвы** і ня маючы магчымасьці асабіста падзякаваць усім знаёмым і прыяцелям нашым, ахвяраваўшым свой час і прыняўшым удзел у пахаронах мужа, а таксама прыслаўшым спагаду майму гору — гэтым шчыра, шчыра дзякую ім усім і за добрую памяць і за аказаную чэсьць.

Удава Юлія Арэхва.

Ад Віленскае Белар. Гімназіі. Дырэкцыя Гімназіі паведамляе, што просьбы бацькоў аб дапушчэньні іх дзяцей да ўступных экзаменаў, восеньню будуць прымацца толькі да 15 жніўня. Просьбы пішуцца на імя Куратарыюму Віленскага Школьнага Вокругу, але прысылаюцца разам з дакумэнтамі ў Дырэкцыю Гімназіі.

Дырэкцыя.

Дня 28 г. м. у чацьвер у Салі Віл. Бел. Гімн. (Вострабрамская 9) адбудзецца апошні ў гэтым школьным годзе вучнёўскі суботнік.

Пастаўлена будзе пьеса Т. Г. (першы раз у Вільні) пад назовам „Зьезд". Апрача таго, праграму вечарыны дапоўніць канцэртны аддзел, у склад каторага ўвойдуць беларускія песьні з новай гарманізацыяй праф. Галкоўскага. Пачатак а 8 гадз. увеч. Уваход па запросінах.

Тэлефонныя гутаркі з Менскам і Масквою. Паштовы ўрад у Стоўпцах атрымаў дазвол на тэлефонныя гутаркі з Менскам і Масквою. (Кур. Віл. № 130).

Вынікі выбараў у гарадзкую раду ў Берасьці. У нядзелю, 17 г. чэрвеня, адбыліся выбары ў гарадзкую раду ў Берасьці. Права галасаваньня мела 16,874, галасавала 9,665 чалавек. Як падае ў 136 нумары „Кур. Віл.", сьпісак № 1 (ББ) атрымаў 6 мандатаў, № 2 (ППС)—2 манд., № 3 (жыд.)—3 манд., Бунд—1 манд., Лявіца Паолей-Сіону — 3 мандаты, Паолей-Сіон—1 мандат, Камуністы—2 манд., Расейцы—1 мандат і 2 мандаты іншыя „групіроўкі".

Урад музэю імя І. Луцкевіча дзякуе гр. гр. Баханянцы і Глебавай за надасланыя старыя манэты.

Бабры ў Зах. Беларусі. У Баранавіцкім павеце на рацэ Шчары зьявіліся бабры. Трэба адзначыць, што бабры ў Зах. Беларусі былі да шчэнту зьнішчаны сусьветн. вайной.

Земляробныя работнікі жадаюць падбаўкі. З прычыны надыходзячага тэрміну надпісаньня новай зборнай умовы з абшарнікамі, земляробныя работнікі пастанавілі дамагацца 30 прац. падбаўкі.

Забастоўка работнікаў у Шчучыне (Лідзкім). У Лідзкім Шчучыне выбухла забастоўка ў фабрыках дзеравяных прадуктаў бр. Канапацкіх. Бастуючыя, больш 150 работнікаў і работніцаў дамагаюцца павялічэньня платы.

Валакняная забастоўка ў Беластоку. Забастоўка валакняных работнікаў у Беластоку прадаўжаецца бяз зьменаў. Апошнімі днямі адбываюцца работніцкія вечы. Агульны настрой—процi прапазіцыі працадаўцаў (пачацьце працы за 6 прац. падбаўкі) і за забастоўку да перамогі. Выносяцца пастановы заклікаць да забастоўкі работнікаў небастуючых яшчэ фабрыкаў.

Жаданьне падбаўкі. Работнікі, працуючыя ў драўняным промысьле на абшарах Віленскага ваяводзтва зажадалі 75 прац. падбаўкі. Драўняныя работнікі гор. Вільні з такім жаданьнем ня выступілі, бо працадаўцы падвысілі ім плату ад 10-12 прац.

(K. W. № 130).

Арышты работнікаў. У сувязі з забастоўкай у фабрыцы бр. Канапацкіх у Шчучыне Лідзкага павету арыштаваны ў Вільні і дастаўлены ў Шчучын сэкрэтар Акружнога Прафэсыянальнага Саюзу Работнікаў Драўлянага Прамыслу ў Вільні, Янка Паэвальскі. Арышт Паэвальскага быў вынікам, як піша „Кур. Віл.", „зласьлівай" агітацыі і падбурываньня да гвалтаў. Арыштаваны яшчэ Антон Ліхадзяеўскі, Янка Півоньскі, Станіслаў Вольскі, Антось Чорнавус і Антон Семашка. Гэтым арыштаваным закідаюць ушкоджаньне вадаправодных трубаў, якое, па думцы адпаведных уладаў, магло-бы выклікаць разрыў катла.

З Т-ва Бел. Школы.

АДОЗВА.

Да грамадзярства Войстамскае воласьці і вакалічных вёсак.

Сумна глядзець, як да гэтага часу наша моладзь і моладзь суседніх вёсак, праводзіць вольны час у бессэнсоўных забавах і піятыцкіх гульнях, якія часта даводзяць моладзь да бойкі.

Марнуем мы часта апошні свой грош на атруту гарэлку і толькі самі на сябе наракаем, што, нам блага жывецца, а ўзапраўднасьці, дык гэтае „блага", існуе ў нас, толькі, з прычыны нашай несьвядомасьці.

Заглянем мы ў другія вёскі, хоць-бы нашага Вялейскага павету, у бок Вялейкі, і ўбачым зусім другое.

Там творацца гурткі Т-ва Бел. Школы, гэтай адзіннай нашай культурна-асьветнай арганізацыі, адчыняюцца народныя дамы і бібліятэкі, гдзе можна правясьці вольны час за кніжкай і газэтай, а заместа піятыцкай вечарынкі, мы бачым вясковыя тэатры.

Час аднак і нам, за прыкладам другіх, узяцца за культурную працу, час на векі вечныя пазбыцца п'янства.

Зьдзейсьніць гэтыя ідэалы мы можам толькі дружнай, цеснай арганізованасьцю і ўсільнай культурна-асьветнай працай, на чым у кожнага з нас на сэрцы ляжыць грамадзкі абавязак, каторы мы павінны заразжа выканаць.

Дык-жа грамадзяне! Даволі п'янства.

Культурна-асьветная праца хай будзе лепшым лёзунгам.

Мішуцкі Гурток Т-ва Бел. Школы кліча Вас усіх да працы!

Запісвайцеся ў сябры Т-ва Бел. Школы.

Складайце ахвяры на карысьць новазаложанай пры Гуртку Т-ва бібліятэкі-чытальні. Калі хто мае прачытаныя ўжо кніжкі, ахвяруйце іх на карысьць бібліятэкі, або хоць-бы пазычце, каб і сусед Ваш, прачытаўшы кніжку, спазнаў, гдзе праўда.

Памятайце, што, бібліятэка - чытальня, гэта рассаднік асьветы, бо толькі праз кніжку, мы здабудзем сваё лепшае жыцьцё.

Дык-жа да працы, у добры час!!!

Управа Гуртка.

З працы Г-коў Т-ва Беларускае Школы.

(М-ка Глыбокае, Дзісьненскага павету).

21 красавіка г. г. Акружная Управа Т-ва Бел. Школы ў м-ку Глыбокім наладзіла спэктакль-вечарыну. Былі згуляны п'есы „Суд" — Галубка і „Модны" Шляхцюк" — К. Каганца. Па спэктаклю адбылася дэклямацыя вершаў: „Ворагам беларушчыны", „Пагоня", „Покліч", „Родны Край" і інш. Спэктакль прайшоў вельмі добра, бо навет і „паны" былі ім задаволены. Пажадана было-б, каб усе вёскі, акружаючыя Глыбокае, ўзяліся за культурна-асьветную працу на карысьць працоўнага народу.

× (В. Вострава, Міжавіцкай гміны Слонімскага павету). У в. Вострава 6. V. 28 г. гуртком Т-ва Бел. Школы быў наладжаны спэктакль. Згуляны былі п'есы „Птушка Шчасьця" і „Мікітаў Лапаць". Спэктакль прайшоў ня вельмі добра, з прычыны таго, што артысты былі першы раз на сцэне. Заклікаем моладзь Вострава ўзяцца шчырэй за працу, на карысьць вызваленьня працоўнага народу з путаў няволі.

× (М-ка Азярніца, Чамерскай гм., Слонімскага павету). 18. V. 28 г. Гуртком Т-ва Беларускае Школы ў м. Азярніцы быў наладжаны спэктакль-вечарына. Згулялі „Пісаравы імяніны"—Галубка і „Рубель твой — будзе мой"—жарт у адным акце, пераложаны з расейскае на беларускую мову Управай Гуртка.

22-га траўня г. г. тым-жа Гуртком у м. Азярніцы быў наладжаны ізноў спэктакль, з прычыны вялікага збору людзей у гэты дзень у Азярніцы. Пастаўлены былі „Страхі жыцьця"—Аляхновіча і камэдыя ў 1-м акце „Безработныя"—таксама пераложаная з расейскае мовы Управай Г-ка. Гэтыя дзьве вечарыны прайшлі найлепей за ўсе, якіх ужо ў Азярніцы было аж пятнаццаць.

На ўвагу заслугоўваюць артысты: Урублеўскі В. у ролі Сымона ў „Страхах жыцьця" і Лабовіч Г. у ролі Юзі.

У камэдыі вызначыўся Аляксейчык Янка.

× (В. Хвалава, Пружанскага павету). Хвалаўскім Г-ком Т-ва Беларускае Школы 8. I. 28 г. быў наладжаны спэктакль-вечарына. Адыграны былі п'есы: „Птушка Шчасьця" і „Заручыны Паўлінкі".

Пасьля спэктаклю хор прапяяў некалькі беларускіх песень.

15. II. 28 г. гэтым-жа Г-ком ізноў быў наладжаны спэктакль - вечарына. Адыгралі п'есы: „Зьбянтэжаны Саўка", „Пасланец" і зноў „Птушку Шчасьця". Народу было шмат і ўсе былі задаволены. Зьвяртаецца ўвага на кепскія адносіны некаторых маладых хлапцоў да спэктаклю.

Пара, пара, моладзь, ужо прабудзіцца і вызваляцца з путаў няволі!

× (В. Жараковічы, Ляхавіцкай гм., Баранавіцкага павету). 16. V. 28 г. Жараковіцкі Гурток Т-ва Белару. Школы наладзіў спэктакль-вечарыну. Згуляна была п'еса „На вёсцы". Пасьля п'есы адбылася дэклямацыя і нарэшце пяяньне беларускіх песень. Спэктакль прайшоў добра. На ўвагу заслугоўвае артыста І. Новік.

Спэктакль-вечарына з'арганізаваны, найбольш дзякуючы стараньням, якія палажыў сэкрэтар Управы Г-ка С. Казаноўскі.

Дзеля гэтага грамадзяне в. Жараковічы прыносяць яму шчырае дзякуй.

Баранавіцкі гурток Т-ва Белар. Школы за працаю.

Нацыянальная сьвядомасьць беларусаў у Баранавічах расьце і пашыраецца. Кожная беларуская вечарына мае сваю сталую публіку, якая захоплена сваім родным і ня хоча мяняць яго на чужое. Гурток Т-ва вядзе канкурэнцыю навет з добрым пасьпехам з расейскай драматычнай трупай, што прыехала з Вільні. Гэта вельмі яскрава выявілася падчас спэктаклю, калі йшла п'еса Аляхновіча—„Шчасьлівы муж" пры перапоўненай салі; у той-жа вечар гуляла і расейская трупа, аднак беларуская вечарына дала поўны зыск.

І толькі пан Назарэўскі (бо „беларускі" сэнатар) пагражае падняць (ці ня разам з Паўлюкевічам?) нябошчыцу „Прасьвету" і адкрыць у Баранавічах „хатку", пэўне-ж, каб баламуціць народ светльна-каляровай ігрой.

Карэспандэнцыі.

У еднасьці сіла.

(Белавеж).

Малазямельле і беззямельле выкідае з вёскі кожны год, як беларусаў так і палякаў, якія прымушаны шукаць сабе заробтку ў Белавежскай пушчы. Тыя, якія маюць на вёсцы па кавалачку зямлі, ня вытрымліваюць гэтай катаржнай работы і на вясну ўцякаюць на свае палоскі зямлі, кажучы: „зарабіў пару залатовак на падаткі і годзе".

Але туга прыходзіцца тым, якія ня маюць і кусочка зямлі. Яны прымушаны для банкіраў-купцоў працаваць за бясцэнак.

Раскажу я аб тартаках „Stoczku" і „Grudku".

Тут селянін-беззямельнік знаходзіць для сябе працу 8 мі гадзінную, Касу Хворых, і навет прафсаюз пад кіраўніцтвам П. П. С. правіцы.

Толькі вось у чым справа. Гэты прафсаюз імкнецца да таго (вядома заданьне ППС правіцы), каб тут тварыць нацыянальную ненавісьць і каб работнік-беларус бачыў у работніку-паляку, або ўкраінцу сваіх страшных ворагаў.

Гэта ім часткова і ўдавалася яшчэ ў прошлым годзе.

Але ўжо ў 1928 годзе клясавая сьвядомасьць рабочых узрасла.

Доказам гэтага можа служыць салідарнае сьвяткаваньне 1-га мая.

Апрача таго, 7-га мая на пільнях „Сточак" і „Грудэк" пачалася забастоўка.

Бастуе каля 1000 чалавек, просячы 50% падвышкі.

Гэтая першая масавая забастоўка сьведчыць аб тым, што тут зграмадзіўся сьвядомы пралетарыят розных нацыяў, які ня дасьць сябе абаламуціць нацыянальнымі сваркамі, як гэта было ў прошлым годзе.

І ППС-ам ня ўдасцца цкаваць работніка-беларуса на работніка-паляка, бо апошнія зразумелі ўжо, што работнікі розных нацыяў супольнымі сіламі змогуць перамагчы вайго ворага — капіталіста.

Дуб.

Змаганьне за беларускую школу.

(Воласьць Новы Пагост, вёска Каўшалёва, павету Браслаўскага).

У сакавіку месяцы 1925 г. нашыя сяляне пастанавілі дабіцца бел. школы. Дасталі дэкляраныі і дружна, як адзін, панясьлі да войта на зацьверджаньне, што войт, не бяз малых клопатаў зрабіў. Не хацеў толькі зацьвердзіць дзьве дэкляраныі, бо бацькі былі хворыя і не маглі прыйсьці ў гміну.

Дэкляраныі трэба было даставіць Інспэктару да 31 сакавік 1925 г. Ня гледзячы на цяжкі веснавы час, мы сабралі апошнія грашы і паслалі паўнамоцніка ў Глыбокае. Ен занёс дэкляраныі, але расьпіскі ня ўзяў, бо Інспэктара ня было дома.

Праз месяцы два пачынаюць да нас прыяжджаць ад Інспэктара. Адзін едзе аглядаць будынак, другі—як кіраўнік школы, трэйці — спраўджаць падпісы, чацьвёрты — пытаецца, ці запраўды хочаце беларускай школы і г. д. Кожны-ж угаварваў падпісацца на польскую школу, а там будзе, кажа, і беларуская.

Нарэшце польскі вучыцель склікае сход і пагрозамі прымушае нас адмовіцца ад беларускай школы і падпісацца на польскую. Усе сяляне ўцяклі са сходу. Тагды солтыс хадзіў з хаты да хаты за подпісамі, але таксама нічога не зрабіў. Нарэшце сам Інспэктар склікае сход, дзе абзывае „бальшавікамі" і страшыць арыштамі. Баязьлівыя сяляне адмовіліся ад сваіх праўных жаданьняў і такім чынам кінулі змаганьне за родную школу.

Цяпер у нас з'арганізаваўся гурток Таварыства Бел. Школы і мы саматугам вучымся, чытаем кніжкі з бібліятэкі. Мы верым, што толькі ўласнымі сіламі даб'ёмся свайго.

Сьвядомы.

Да працы браты!

(Вёска Урач, Слонімскага павету).

Шмат вёсак зразумела, што, змагаючыся за свае правы, за родную культуру, можна палепшыць жыцьцё працоўных. Але шмат вёсак яшчэ гэтага не разумеюць і тонуць у цемры, а моладзь займаецца п'янствам. Да гэтых вёсак можна залічыць в. Урач, хоць тут ёсьць Гурток Т-ва. Сяляне, не належачыя да Т-ва, п'юць гарэлку за апошнія грошы. Браты! Кіньце п'янства і ўсялякую раснусту. Няхай кожны з Вас падкіне палена ў тое вялікае полымя роднае культуры, якое ахапляе нашу старану. Ідзём разам да вызваленьня ўсіх працоўных!

Ворaг цемры.

Лёс цывільных асаднікаў.

Польскі Урад перапоўніў нашы няшчасныя „Крэсы" асаднікамі, як быццам для таго, каб (сьмех сказаць!) падняць культуру сярод „цёмнага" сялянства. Атрымалі гэтыя „культурнікі" ад 10 да 30 гэктараў зямлі.

Якую-ж культуру прывязьлі яны на нашы „Крэсы" і які лёс спаткаў іх тут. Каб адказаць на гэтае пытаньне, возьмем двор Марысін, Маўчадзкае гм. і — Крутаўцы, Гарадыскае гміны, ведамыя ў ваколіцах добрай якасьцяй зямлі, лесу і лугоў. Справа ў тым, што „культурнікі", атрымаўшы тут ад 10 да 30 гэктараў добрае зямлі, яны здразу пачалі „хварэць на паноў". Нічога ня робяць, а жывуць на „шырокую нагу".

Аднак, гэта доўга не цягнулася. Райскае жыцьцё хутка скончылася. „Культурнікі" з торбачкамі ідуць на вёску, каб выпрасіць у „цёмных" сялян што-небудзь на падтрыманьне свайго жыцьця і жыцьця жывёлы. Некаторыя навет кідаюць свае гаспадаркі і ідуць у парабкі. „Цёмны" селянін, маючы 1—3 дзесяціны зямлі, з працы сваіх рук можа пражыць і ня йсьці жабраваць. А „культурнікі" маюць па 30 дзес. і прымушаны жабраваць.

Вось дык „Заходняя культура"!

Ярашэвіч.

Гоняць панскіх падбрэхавічаў.

(В. Казлы, Нясьвіжскага павету).

Нядаўна ў нашу вёску прыехаў нейкі „невядомы" чалавек, і прыказаў солтысу заразжа склікаць сход.

Сабраліся.

Увайшоў той „незнаёмы" і пачаў да ўсяго сходу, каб усе тыя, хто прыймаў удзел у галасаваньні пры выбарах у Сойм, распісаліся, што пры галасаваньні ніхто не прымушаў кідаць № 1-га, а хто які хацеў. Тады са сходу пачалі крычаць: „Як-жа ніхто ня прымушаў, калі ты сам стаяў у калідоры і адбіраў у сялян розныя нумары, даючы заместа іх № 1-ы"?

Бачыць „незнаёмы", што „дзела табак", ды давай Бог ногі.

Не, падбрэхачы панскія, годзе ўжо вам абдурваць беларускага селяніна.

М. Р.

Сьпіць наша моладзь.

(Вёска Прыхілы, Слонімскага павету).

Радасьць і надзея ўздымаецца ў чалавека, калі прыгледзімся, як гурток Т-ва ў Масілавічах пашырае асьвету сярод старых і малых, залажыўшы бібліятэку і ладзячы спэктаклі.

Чэсьць барацьбітам з цемрай!

Ня тое ў вёсцы Прыхілах і Трыбушках. Там моладзь нечага чакае; чакае таго, што само ніколі ня прыходзіць. Пара, браткі, вырвацца з рук цемры, змагацца за лепшае жыцьцё працоўных! Пара залажыць Гурток Т-ва Бел. Школы.

Блізкі.

Нашы „апякуны".

(г. Баранавічы),

У Баранавічах з паўгода ўжо існуе Т-ва Беларускае Школы. Няпрыхільнасьць з боку розных групаў і асоб, брак матэрыяльных срэдзтваў—вось у якіх абставінах мусіць яно працаваць.

Але сябры Т-ва не зражаюцца перашкодамі. За сабраныя ахвяры і сяброўскія ўзносы нанялі памешканьне, закупілі трохі кнігаў і праца памаленьку наладжваецца.

Аднак, бачылі яны, што гэтага замала, а ведаючы, што Магістрат кожны год дае субсыдыі культ.-асьветн. арганізацыям, зьвярнуліся 15. II. б. г. да Гарадзкое Рады з просьбаю аб помач. Хутка потым адбылося пасяджаньне Гар. Рады, на каторым быў ухвалены гарадзкі бюджэт, аднак просьба Т-ва зусім ня была разгледжана.

Калі Т-ва пачало даходзіць адказу, просьбу правялі цераз Раду, прычым справа была пастаўлена гэтак, што беларуская бібліятэка яшчэ ня існуе, а ня існуючым бібліятэкам помач не аказваецца (ў просьбе было ясна зазначана, што бібліятэка існуе і трэба толькі помач на яе пашырэньне). Ніхто з радных ня пікнуў ані воднага слова.

Вось якую мы маем апеку й помач.

Я. Б.

Паштовая скрынка.

Амельяновічу і Друшчыцу. Ваша пісьмо ў Рэдакцыю, у якім вы паведамляеце аб дармавой прысылцы газ. „Беларускі Дзень" на Вашы адрасы, якія п. Умястоўскаму дасталіся няведамай дарогай—дасталі. Вельмі рады Вашай сьведамасьці і разуменьню запраўднага аблічча „дзядзькі" Умястоўскага, але пісьма не зьмяшчаем з тае прычыны, што Умястоўскі ўжо цяпер — труп. За карэспандэнцыю—Вашу, пад назовам „Наша жыцьцё" газэту напэўна канфіскуюць, а таму таксама не зьмяшчаем. — **С. Жыткевічу.** Ваш зварот да радных у справе вызначэньня стыпэндыяў у Беларускіх гімназіях ужо папяраджаны стацьцёй у № 7 нашай газэты. Спадзяёмся, што радныя нашы зразумеюць, што гэта найбольш адносіцца да іх. — **Бому.** Вершы Вашы перададзены ў Рэдакцыю новай часопісі. **Я. Няшчаснаму.** Ваша карэспандэнцыя падходзіць пад канфіскату. Пішэце больш. — **Пакрыўджанаму.** Ваша спраставаньне пісьма Слонімскага Старасты зьмесьцім у наступным нумары.—**Новаму, Вясковаму, Цярпігораву, Сумуючаму, Беднаму, Вожыку**—таксама. — **Рыбалту.** Вашы вершы, нажаль, мусілі пайсьці ў кошык.—**Вішнеўскаму**—таксама.—**Я. Няшчаснаму.** З іншых карэспандэнцыяў, прысланых Вамі, па меры магчымасьці скарыстаем. Дзякуем. Пішыце, як найкарацей. — **Тутэйшаму.** Пішэце аб чым небудзь іншым, падаючы канкрэтныя факты. Карэспандэнцыя Ваша да друку не падходзіць. — **Крэсоваму.** Карэспандэнцыі Вашай зьмясьціць ня можам.

Ці Вы прыдбалі хоць аднаго платнага падпішчыка для нашай газэты?

Чытайце і пашырайце сваю сялянска-работніцкую газэту.

Сяляне і работнікі!

Памятайце, што кожнае слова Вашае газэты Вас усьведамляе, а кожны Ваш грош запэўняе ей існаваньне.

Рэдактар-Выдавец: Ал. Рудзінскі.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.